Калі жанчына пад’ехала да таго месца, дзе раней быў крыж, конь стаў на дыбы і іржаў, вырываючы лейцы з рук жанчыны. Яна, спалоханая, паглядзела ў бок, дзе раней знаходзіўся крыж, і ўбачыла Матку Боску Балесну ў чорнай вопратцы.

Праз некаторы час на сходзе аднавяскоўцаў было вырашана паставіць на тым месцы новы крыж. Гэта месца з’яўляецца пэўным месцам паломніцтва і веры.

Такім чынам, звяртаючыся да пытання, чым для рэспандэнтаў з’яўляецца крыж, аналізуючы гісторыю ўстанаўлення крыжа ў вёсцы Самаравічы, можна зрабіць вывад – крыж з’яўляецца сімвалам веры. Пра гэта сведчаць паклонныя крыжы, крыжы ў вёсках і гарадах, таксама крыжы на месцах трагедый і катастроф. Найбольш распаўсюдзілася менавіта такое значэнне крыжа ў параўнанні з яго значэннем у якасці прадмета ў мастацтве [2].

Літаратура:

1. Крыж як старажытны сімвал чалавецтва. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://oroik.by/kryzh-yak-starazhytny-simval-chalavectva/?ysclid=m1xtrm3bwy949293065. – Дата доступу: 06.10.2024.

2. Традыцыі ўшанавацця крыжа беларусамі ў канцы XIX ст. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://media.catholic.by/nv/n5/art15.htm. – Дата доступу: 06.10.2024.

# СЭРВІСЫ WEB 2.0 ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ ПАТРЫЯТЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ ВУЧНЯЎ НА І СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

**Сячко П. В.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – канд. філал. навук, дац. Лапкоўская А. М.

Духоўнае багацце народа адлюстроўваецца ў яго нацыянальных звычаях і нацыяналнай культуры. Беражліва захоўваючы спадчыну мінулага, суверэнная Беларусь закладвае новыя традыцыі і фарміруе патрыятычную культуру маладых людзей. У беларускіх нацыянальных традыцыях нашы лепшыя дасягненні і якасці: міласэрнасць і прыязнасць, душэўная шчодрасць і гатоўнасць падзяліцца ўсім, што маем. Беларусь сёння дэманструе ўсяму свету, як трэба адстойваць свой суверэнітэт [1].

Выхаванне любові да роднай беларускай мовы, беларускай культуры і спадчыны – важная задача, якая стаіць перад настаўнікамі на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі. У сучасным грамадстве немалаважнае значэнне займае фарміраванне патрыятычнай культуры вучняў, патрыятычнай свядомасці

Репозиторий ГрГМУ

грамадзян як найважнейшай каштоўнасці, якая з'яўляецца адной з асноў духоўна-маральнага адзінства грамадства.

Ва ўмовах развіцця навукова-тэхнічнага прагрэсу на дапамогу ў сферы патрыятычнага выхавання прыходзіць Інтэрнэт, у якім існуе вялікая колькасць матэрыялаў па гістарычнай, ваеннай і патрыятычнай тэматыцы, а таксама сэрвісы Web 2.0, што дапамагаюць сабраць і адаптаваць дадзеную інфарамацыю для вучняў на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Выкарыстанне сэрвісаў Web 2.0 становіцца важнай і карыснай часткай навучання. Тэхналогіі Web 2.0 прапануюць педагогам і вучням вялізныя магчымасці для эфектыўнасці навучання, спрыяюць развіццю пазітыўнай матывацыі да навучання, здольнасці да самастойнай пошукавай дзейнасці, творчаму падыходу да навучання, а таксама крытычнага мыслення дзяцей.

Можна, не выходзячы з дому, наведаць Музей вайны – тэрыторыя міру (https://clck.ru/3E5B4c), Музей абароны Брэсцкай крэпасці (https://clck.ru/3E5BBL) і экспазіцыю «Летапіс Брэсцкай крэпасці» (https://clck.ru/3E5BE7), пахадзіць па залах, разгледзець экспанаты. Акрамя віртуальнага тура па Брэсцкай крэпасці можна віртуальна наведаць: Белавежскую пушчу (https://clck.ru/3E5Hb8); Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь (https://clck.ru/3E5HcQ); Мемарыяльны комплекс «Хатынь» (https://clck.ru/3E5HeK); Музей гісторыі Вялікай айчыннай вайны (https://clck.ru/3E5Hgd); Віртуальны экскурс «Гарады-героі» (https://clck.ru/3E5Hje); Форт № 1 у Гродне (https://clck.ru/3E5HyQ); Форт №4 у Гродне (https://clck.ru/3E5J3C); Форт № 7 у Гродне (https://clck.ru/3E5J73); Музейны комплекс старажытных народных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі» (https://dudutki.by/); Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа (http://kolas.museum.by/); Дом-музей Элізы Ажэшкі (https://clck.ru/3E5JC3); Дом-музей Адама Міцкевіча (https://clck.ru/3E5JDd); Віртуальны тур па Палацы Рэспублікі (https://clck.ru/3E5JGX); Віртуальны тур па замкавым комплексе «Мір» (https://clck.ru/3E5JHs); Беларускі дзяржаўны музей народнай культуры і побыту «Строчыцы» (https://clck.ru/3E5JKc) і іншыя [2].

Акрамя Інтэрнэту, важную ролю складаюць інавацыйныя тэхналогіі. Напрыклад, вэб-сэрвісы могуць актыўна выкарыстоўваюцца педагогамі ў якасці інфармацыйна-метадычнай платформы: для правядзення класных гадзін, ранішнікаў, пазакласных мерапрыемстваў, урокаў мужнасці, адкрытых урокаў, электронных прэзентацый, літаратурна-музычных кампазіцый, удзелу ў розных конкурсах патрыятычнай накіраванасці, насценгазет, напісання сачыненняў, рэфератаў, эсэ і інш. [2].

Для павышэння ўзроўню фарміравання патрыятычнай культуры вучняў на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі намі быў распрацаваны і апрабаваны адукацыйны вэб-квэст «Ад прадздаў спакон вякоў мне засталася спадчына» (https://clck.ru/3ArpmW). Асноўныя сродкі рэалізацыі вэб-квэста: сэрвісы Google, сэрвіс стварэння інтэрактыўных практыкаванняў LearningApps.org.



Рэпазіторый ГрГМУ

Мэта вэб-квэста – цікава і займальна замацаваць веды вучняў 4 класа па тэме «Абагульненне па раздзеле «Чалавек і Радзіма», фарміраваць у іх пачуццё патрыятызму і гонару за сваю краіну.

Задачы: адукацыйная: замацаваць веды вучняў IV класа па тэме «Абагульненне па раздзеле «Чалавек і Радзіма»; выхаваўчая: садзейнічаць выхаванню ў вучняў пачуцця патрыятызму і гонару за сваю краіну; развівальная: узбагачаць слоўнік вучняў [3].

Пасля правядзення сістэматычнай работы з выкарыстаннем распрацаванага адукацыйнага вэб-квэста і выкарыстаных ў ім Інтэрнэт-рэсурсаў узровень ведаў сфарміраванасці патрыятычнай культуры вучняў павысіўся: высокі ўзровень – на 13 % , сярэдні зменшыўся на 8 %, а нізкі – на 5 %.

Такім чынам, сэрвісы Web 2.0 з'яўляюцца эфектыўным інструментам фарміравання патрыятычнай культуры, любові да Радзімы, яе гісторыі і герояў, а таксама захавання нацыянальных традыцый і спадчыны.

Літаратура:


1. Традиции суверенной Беларуси [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://president.gov.by/ru/belarus/traditions. – Дата доступу : 30.09.2024.
2. Астрэйка А. Г. Прадстаўніцтва беларускіх музеяў у віртуальнай прасторы / А.Г. Астрэйка // Весн. Беларус. Дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2015. – № 1. – С. 157–164.
3. Зубко, Д. П. Сучасныя аспекты выхавання патрыятызму і грамадзянскасці / Д. П. Зубко // Праблемы выхавання. – 2005 – № 1 – С. 12–16.


## ГІСТОРЫЯ МАГІЛЁВА: МІНУЛАЕ І СУЧАСНАСЦЬ


**Якаўлева А. П.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Сняжыцкая А. С.


Мэтай дадзенай працы з’яўляецца вывучэнне культурнай спадчыны малой Радзімы.

Магілёў – гэта абласны цэнтр Беларусі, які вырас на берагах ракі Днепр. Тут змяшаліся традыцыі і культура многіх пакаленняў. Гэта горад, які, быццам каштоўная скарбонка, захоўвае мноства таямніц і цікавых гісторый. Сваю гісторыю Магілёў пачынае з 1267 года. Існуе некалькі версій, чаму горад назвалі менавіта Магілёвам. Адна з асноўных звязана з імем галіцкага князя Льва Данілавіча Могія. У 1267 годзе галіцкі князь Леў Данілавіч Могій загадаў пабудаваць тут замак. Сюды пачалі з'язджацца рамеснікі, рыбакі і гандляры. Толькі вось ніякіх пацверджанняў існавання гэтага замка няма, а ў адной з памятных кніг Магілёўскай губерні ёсць паданне, якое звязвае заснаванне



Репозиторий ГрГМУ